Камунiстычная партыя (бальшэвiкоу) Беларусi

Бiблiятэка АН БССР

# Калгаснiк Капыльшчыны

Орган Капыльскага РК КП(б) Беларусi.

№ 20 (1773)
ЧАЦВЕР 4 МАЯ 1944 г.

**Смерць нямецкiм акупантам!**

**Каб пазбавiць нашу краiну и саюзныя з намi краiны ад небяспекi прыгнету, трэба праследаваць раненага нямецкага звера па пятах и дабiць яго у яго уласнай бярлозе.**

(З Загада Вярхоунага Галоунакамандуючага Маршала Савецкага Саюза **И. СТАЛIНА** ад 1 Мая 1944 года).

# ЗАГАД

## ВЯРХОЎНАГА ГАЛОЎНАКАМАНДУЮЧАГА

**1 мая 1944 года. № 70. гор. Масква.**

Таварышы чырвонаармейцы и чырвонафлотцы, сяржанты, афiцэры и генералы, партызаны и партызанки!

Працоуныя Савецкага Саюза!

Браты и сёстры, часова папаушыя пад iга нямецкiх прыгнятальнiкау и гвалтоуна угнаныя на фашысцкую катаргу у Германiю!

Ад iмени Савецкага Урада и нашай бальшэвiцкай Партыи витаю и вiншую Вас з днем 1-га Мая!

Народы нашай краiны сустракаюць дзень 1-га Мая у абстаноуцы выдаюшчыхся поспехау Чырвонай Армии.

З часу разгрома нямецкiх дывiзiй пад Сталiнградам Чырвоная Армiя вядзе амаль непрарыунае наступленне. За гэты час Чырвоная Армiя прайшла з баямi ад Волгi да Серэта, ад прадгор'яу Кауказа да Карпат, знiшчаючы варожую нечысць и вымятаючы яе з Савецкай зямлi.

У ходзе зiмовай кампанiи 1943-44 г. г. Чырвоная Армiя выйграла гiстарычную бiтву за Днепр и Правабярэжную Украiну, сакрушыла магутныя абаронныя умацаваннi немцау пад Ленiнградам и у Крыму, умелымi и пыклiвымi дзеяннямi праадолела нямецкую абарону на водных рубяжох—Паудзённы Буг, Днестр, Прут, Серэт. Амаль уся Украiна, Малдавiя, Крым, Ленiнградская и Калiнiнская вобласцi, значная частка Беларусi ачышчаны ад нямецкiх захопнiкау. Радзiме звернуты металургiя Поудня, руда Крываражжа, Керчы и Нiкаполя, пладародныя землi памiж Днепром и Прутам. З фашысцкага рабства вызвалены дзесяткi мiльёнау савецкiх людзей.

Выконваючы вялiкую справу вызвалення роднай зямлi ад фашысцкiх захопнiкау, Чырвоная Армiя выйшла к нашым дзяржауным граніцам з Румынiяй и Чэхаславакiяй и працягвае цяпер грамiць варожыя войскi на тэрыторыи Румынii.

Поспехi Чырвонай Армiи сталi магчымымi дзякуючы правiльнай стратэгii и тактыцы савецкага камандавання, дзякуючы высокаму маральнаму духу и наступальнаму парыву нашых байцоу и камандзiрау, дзякуючы добраму аснашчэнню нашых войск першакласнай савецкай ваеннай тэхнiкай, дзякуючы узросшаму искуству и вывучцы нашых артылерыстау, мiнамётчыкау, танкiстау, лётчыкау, сувязiстау, сапёрау, пехацiнцау, кавалерыстау, разведчыкау.

Гэтымi поспехамi у значнай меры садзейнiчалi нашы вялiкiя саюзнiкi—Злучаныя Штаты Амерыкi и Вялiкабрытанiя, якiя трымаюць фронт у Iталii супроць немцау и адцягваюць ад нас значную частку нямецкiх войск, забяспечваюць нас вельмi цэнным стратэгiчным сыр'ём и узбраеннем, падвяргаюць сiстэматычнай бамбардзiроуцы ваенныя аб'екты Германii и падрываюць такiм чынам ваенную магутнасць апошняй.

Але поспехi Чырвонай Армii маглi-б аказацца нетрывалымi, яны былi-б зведзены на нiшто пасля першага-ж сур'ёзнага контрудара з боку працiунiка, калi-б Чырвоную Армiю не падпiралi з тылу увесь наш савецкi народ, уся наша краiна. Чырвоная Армiя у баях за Радзiму праявiла бясприкладнае геройства. Але савецкi народ не застауся у даугу перад Чырвонай Армiяй. У цяжкiх умовах вайны савецкi народ дабiуся рашаючых поспехау у справе масавай вытворчасцi узбраення, агнеприпасау, абмундзiравання, харчавання и своечасовай дастаукi их на франты Чырвонай Армii. За прайшоушы год сур'ёзна узрасла магутнасць савецкай прамысловасцi. У строй уступiлi сотнi новых заводау, шахт, дзесяткi электрастанцый, чыгуначных лiнiй, мастоу. Новыя мiльёны савецкiх людзей сталi к станкам, авалодалi самымi складанымi прафесiямi, зрабiлiся майстрамi свяей справы. З чэсцю вытрымалi испытаннi вайны нашы калгасы и соугасы. Не пакладаючы рук, савецкае сялянства у цяжкiх умовах ваеннага часу працуе на палёх, забяспечваючы харчаваннем нашу армiю и насельнiцтва, пастауляючы сыр'е нашай пра-

(Працяг на 2-й старонцы).

экр 3224



# Працяг Загада Вярхоунага Галоунакамандуючага

мысловасци. А наша интэлигенцыя абагацила совецкую навуку и тэхнику, культуру и мастацтва новыми выдаюшчымися дасягненнями и адкрыццями. Неацанимыя заслуги у справе абароны Радзимы маюць совецкия жанчыны, самаадданна працуючыя у интарэсах фронта, мужна пераносячыя усе цяжкасци ваеннага часу, натхняючы на ратныя подвиги воинау Чырвонай Армии—вызвалицеляу нашай Радзимы. Айчынная вайна паказала, што совецки народ здолен тварыць цуды и выходзиць пераможцам з самых цяжких испытанняу. Рабочыя, калгасники, совецкая интэлигенцыя, увесь совецки народ перапоунены рашучасцю ускорыць разгром ворага, поунасцю аднавиць разрушаную фашистами гаспадарку, зрабиць нашу краину яшчэ больш моцнай и заможнай.

Пад ударами Чырвонай Армии трашчыць и развальваецца блок фашысцких дзяржау. Страх и перапалох пануюць цяпер сярод румынских, венгерских, финских и балгарских „саюзникау" Гитлера. Зараз гэтыя гитлерауския спадручныя, краины якиx акупираваны и акупируюцца немцами, не могуць не бачыць, што Германия прайграла вайну. У Румынии, Венгрыи, Финляндыи и Балгарыи ёсць тольки адна магчымасць пазбегнуць катастрофы: разрыу з немцами и выхад з вайны. Аднак, цяжка различваць на тое, што цяперашния урады гэтых краин здольны парваць з немцами. Трэба меркаваць, што народам гэтых краин прыдзецца самим узяць у свае руки справу свайго вызвалення ад нямецкага ига. И чым хутчэй народы гэтых краин зразумеюць, у яки тупик завяли их гитлерауцы, чым хутчэй спыняць яны усякую падтрымку сваих нямецких прыгнятальникау и их спадручных-квислингау у сваёй уласнай краине, тым менш ахвяр и разбурэнняу панясуць гэтыя краины ад вайны, тым больш яны могуць различваць на разуменне дэмакратычных краин.

У вынику паспяховага наступлення, Чырвоная Армия вышла на нашы дзяржауныя границы на працягу больш 400 километрау, вызвалиушы ад нямецка-фашысцкага ига больш $^3/_4$ акупираванай совецкай зямли. Справа цяпер заключаецца у тым, каб ачысциць ад фашысцких захопникау усю нашу зямлю и аднавиць дзяржауныя границы Совецкага Саюза па усей линии ад Чорнага мора да Барэнцава мора.

Але нашы задачы не могуць аграничвацца выгнаннем варожых войск з праделау нашай Радзимы. Нямецкия войски напаминаюць цяпер раненага звера, яки прымушан адпаузаць к границам сваёй бярлоги—Германии, для таго каб залячыць раны. Але ранены звер, яки уцёк у сваю бярлогу, не перастане быць небяспечным зверам. Каб пазбавиць нашу краину и саюзныя з нами краины ад небяспеки прыгнету, трэба праследваць раненага нямецкага звера па пятах и дабиць яго у яго уласнай бярлозе. Праследуючы-ж ворага, мы павинны вызвалиць з нямецкай няволи нашых братоу палякау, чэхаслявакау и другия саюзныя з нами народы Заходняй Еуропы, якия знаходзяцца пад пятой гитлерауской Германии. Зразумела, што гэта задача прадстауляе больш цяжкую справу, чым выгнанне нямецких войск з праделау Совецкага Саюза. Яе можна рашыць тольки на аснове сумесных намаганняу Совецкага Саюза, Великабритании и Злучаных Штатау Пауночнай Америки, шляхам сумесных ударау: з Усходу—силами нашых войск и з Захаду—силами нашых саюзникау. Не можа быць сумнення, што тольки таки камбиниравааны удар зможа поунасцю сакрушыць гитлерауcкую Германию.

Таварышы чырвонаармейцы, чырвонафлотцы, сержанты, афицэры и генералы! Партызаны и партызанки! Працоуныя Совецкага Саюза! Браты и сестры, часова падпаушыя пад ига нямецких прыгнятальникау и гвалтоуна угнаныя на фашысцкую катаргу у Германию! Витаю и виншую Вас з святам 1-га МАЯ!

**ЗАГАДВАЮ:**

У чэсць гистарычных перамог Чырвонай Армии на фронце и у азнаменаванне вяликих поспехау рабочых, калгаснику, интэлигенцыи Совецкага Саюза у тылу, сёння, у дзень сусветнага свята працоуных, у 20 гадзин, зрабиць салют у Маскве, Ленинградзе, Гомели, Киеве, Харкаве, Растове, Тбилиси, Симферопали, Одасе—дваццаццю артылерыйскими залпами.

**Няхай жыве наша Совецкая Айчына!**

**Няхай жыве наша Чырвоная Армия и Ваенна-Марски Флот!**

**Няхай жыве Вялики Совецки народ!**

**Няхай жыве дружба народау Совецкага Саюза!**

**Няхай жывуць Совецкия партызаны и партызанки!**

**Вечная слава героям, паушым у баях за свабоду и незалежнасць нашай Радзимы!**

**Смерць нямецким захопникам!**

**Вярхоуны Галоунакамандуючы**
**Маршал Совецкага Саюза И. СТАЛИН.**

**РЭДКАЛЕГИЯ**